9 (218)
верасень
2017 год
Выдаецца са студзеня 1993 г.

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

*Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1221 ад 14 студзеня 2013 г.*

Выходзіць 12 разоў у год (з ліпеня 2003 г.)

НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС

Заснавальнікі:

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Пачатковая школа", дзяржаўная навуковая ўстанова "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

Галоўны рэдактар Максім Навумавіч Гальпяровіч

Рэдакцыйная калегія:

Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.

Рэдакцыйная рада:

Уладзімір Адамушка, Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Аляксандр Корзюк, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.

Рэдакцыя:

Намеснік галоўнага рэдактара — Наталля Матусевіч, рэдактар аддзела — Вітаўт Чаропка, мастацкае афармленне — Уладзімір Малахаў, вёрстка — Надзея Пяткоўская, карэктура — Людміла Шчэрба.

## ЗМЕСТ

Слова ад рэдакцыі 3

ЗНАХОДКІ І АДКРЫЦЦІ

Дзяніс Дук, Іна Калечыц, Аляксей Коц, Яўген Торшын — Парадная пячатка Еўфрасінні Полацкай 4

САЦЫЯЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

Аляксей Шаланда — Гербы аршанскай шляхты ў XVI–XVIII стст. 9

ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

Вольга Папко — Абраз "Божая Маці Шкаплерная" з касцёла ў вёсцы Новая Мыш 17

## ЗМЕСТ


| | | |
|---|---|---|
| Дзмітрый Марозаў | Дзейнасць кансерватара Ежы Рэмера па ахове помнікаў даўніны ў Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.) | 23 |
| | РЭЦЭНЗІІ | |
| Уладзімір Здановіч | Брэст у перыяд нацысцкай акупацыі (1941–1944 гг.) у святле новых дакументаў | 36 |
| | МЕТОДЫКА. ВОПЫТ | |
| Таццяна Мелехава | Старажытны Іран *(Сусветная гісторыя. V клас)* | 42 |
| Ксения Хворост, Елена Валюженич | Изобразительное искусство, архитектура, музыка в XIX — начале XX века *(Всемирная история. IX класс)* | 48 |
| Людмила Тригорлова | Индия в межвоенный период *(Всемирная история. X класс)* | 59 |
| Надежда Кушнер | Органы государственной власти Республики Беларусь: обобщающее задание для подготовки к олимпиаде и ЦТ по обществоведению *(Обществоведение. XI класс)* | 66 |
| Венера Варановіч | Фарміраванне ключавых кампетэнцый навучэнцаў праз пазнанне роднага краю | 70 |
| Наталля Обухава | Віртуальныя музеі ў адукацыйных установах Мінщчыны | 73 |
| | Содержание | 79 |
| | Summary | 80 |


*У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 4 ліпеня 2005 г. № 101 (у рэдакцыі загада Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 2 лютага 2011 г. № 26) "Беларускі гістарычны часопіс" уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных і юрыдычных навуках, а таксама па мастацтвазнаўстве і культуралогіі.*


*Адрас рэдакцыі: 220007, г. Мінск,
вул. Фабрыцыуса, 5, кабінет 211.
Тэлефон: 8(017)395-79-11. http://www.p-shkola.by;
e-mail: bhc.redaktor@tut.by.
РУП "Выдавецтва "Пачатковая школа".
Падпісана да друку 21.09.2017 г.
Выхад у свет 28.09.2017 г. Афсетны друк.
Фармат 60x84 1/8.
Ум. друк. арк. 9,3. Ул.-выд. арк. 11,4.
Наклад 460 асобнікаў. Зак. 687.
Таварыства з абмежаванай адказнасцю "ЮСТМАЖ".
ЛП № 02330/250 ад 27.03.2014 г.
220103, г. Мінск,
вул. Калiноўскага, д. 6, Г 4 К, пак. 201.*


*Да ведама аўтараў!*

*За дакладнасць прыведзеных у артыкулах фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары. Рэдакцыя можа друкаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтараў. Навуковыя артыкулы прымаюцца да разгляду з рэкамендацыяй кафедры (аддзела) вучэбнай або навуковай установы. Рэцэнзаванне арганізоўвае рэдакцыя. Да разгляду прымаюцца рукапісы аб'ёмам не больш за 20 старонак (кегль 14, праз 1,5 інтэрвала) у двух экзэмплярах (абавязкова на электронных носьбітах). Неабходна ў допісах паведамляць свае прозвішча, імя і імя па бацьку, кароткія звесткі пра сябе, пашпартныя даныя (абавязкова асабісты нумар), адрас, тэлефон. Рукапісы не вяртаюцца.*


© "Беларускі гістарычны часопіс", 2017.

РЭЦЭНЗІІ

# Брэст у перыяд нацысцкай акупацыі (1941–1944 гг.) у святле новых дакументаў

4 мая 2017 г. у Брэсцкай абласной бібліятэцы імя А.С.Пушкіна адбылася прэзентацыя зборніка дакументаў "Брест в 1941—1944 гг. Оккупация. Документы и материалы", падрыхтаванага аўтарскім калектывам у складзе дацэнта кафедры ўсеагульнай гісторыі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Я.С.Разенблата і супрацоўнікаў Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці Г.Г.Карапузавай і Г.Д.Калуставай*.




Неабходна адзначыць, што гэта не першае дакументальнае выданне, падрыхтаванае сумеснымі намаганнямі брэсцкіх навукоўцаў і архівістаў. Так, у 2009 г. убачыў свет зборнік "Брест в 1919—1939 гг. Документы и материалы", прысвечаны гісторыі горада ў перыяд паміж дзвюма сусветнымі войнамі, а ў 2012 г. — зборнік "Брест в 1939—1941гг. Документы и материалы", у якім сабраныя дакументы па гісторыі Брэста з верасня 1939 г. па чэрвень 1941 г.[1].

*"Мэта дадзенага зборніка,* — адзначаюць аўтары, — *паказаць жыццё горада ў перыяд акупацыі, а менавіта: структуру акупацыйнага гарадскога кіравання, яго функцыі і сферы дзейнасці; устаноўлены акупацыйны рэжым, умовы жыцця насельніцтва акупаванага горада, стан эканомікі і гаспадаркі, дзейнасць гандлёва-прамысловых прадпрыемстваў, сістэму харчовага забеспячэння горада, падатковую палітыку акупантаў, фінансава-грашовую сітуацыю, стан аховы здароўя і школьнай справы, санітарны стан горада, дэмаграфічную сітуацыю, палітыку акупацыйных улад у адносінах да яўрэйскага насельніцтва горада, у сферы працы і рабочай сілы і інш., а таксама дзейнасць падпольнай партыйнай арганізацыі"* (с. 7). Укладальнікі акцэнтуюць увагу на тым, што разглядаемы перыяд з'яўляецца адным з самых трагічных у гісторыі Брэста.

Выданне складаецца з наступных структурных адзінак: Уводзіны (с. 3—10), Спіс скарачэнняў (с. 11—12), Дакументы і матэрыялы (с. 13—250), Успаміны ўдзельнікаў Брэсцкага гарадскога падполля (с. 251—274), Каментары (с. 275—293), Імянны паказальнік (с. 294—299), Пералік публікуемых дакументаў (с. 300—311), Пералік выкарыстаных крыніц (с. 312). Усяго ў зборніку апублікавана 334 дакументы, 11 запісаў успамінаў, 360 каментараў.

Ва ўводзінах аўтары знаёмяць чытачоў з працэсам стварэння гарадской управы, яе структурай, асноўнымі накірункамі дзейнасці. Адзначаецца, што спачатку ўправу ўзначальваў бургамістр, якога некаторы час называлі прэзідэнтам. На думку аўтараў, *"гэта тлумачыцца тым, што на першых этапах была прыменена польская традыцыя арганізацыі гарадскога самакіравання, якая дзейнічала ў міжваенны перыяд (1921—1939 гг.)"* (с. 3). Першачарговымі задачамі ўправы сталі размяшчэнне ў горадзе германскіх войскаў, забеспячэнне захаванасці маёмасці, пакінутай савецкімі ўстановамі, аднаўленне дзейнасці некаторых прадпрыемстваў. Важнымі накірункамі дзейнасці гарадской управы былі рэгуляванне цэнаўтварэння і падаткаабкладання, правядзенне розных мерапрыемстваў у галіне культуры і адукацыі, аховы здароўя.

Аснову зборніка склалі дакументы, выяўленыя ў Дзяржаўным архіве Брэсцкай вобласці, Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі (матэрыялы Брэсцкай абласной камісіі садзейнічання ў працы Надзвы-

---

* Брест в 1941—1944 гг. Оккупация. Документы и материалы. Брест, 2016. 316 с.

чайнай дзяржаўнай камісіі па г. Брэсце), Беларускім дзяржаўным архіве кінафотафонадакументаў, Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі. Асаблівую каштоўнасць уяўляюць дакументы акупацыйных органаў кіравання, устаноў і арганізацый, у тым ліку органаў мясцовага самакіравання, якія дзейнічалі на тэрыторыі Брэстчыны з чэрвеня 1941 г. па ліпень 1944 г. Былі выкарыстаныя таксама матэрыялы акупацыйнай газеты "Наше слово"— друкаванага органа Брэсцкага акруговага камісарыята.

Дакументы размешчаныя ў храналагічным парадку па шасці раздзелах. Абсалютная большасць з дакументаў і матэрыялаў публікуецца ўпершыню. Адкрывае зборнік *раздзел 1 "Деятельность оккупационных и коллаборационистских органов управления"*, які ўключае 55 дакументаў: распараджэнні рэйхскамісара, акруговага камісара, распараджэнні і загады прэзідэнта і бургамістра горада, аб'явы гарадской управы, справаздачы фінансавых органаў і інш. Многія з гэтых дакументаў утрымліваюць надзвычай цікавую інфармацыю. Так, паводле дакумента № 21, па дадзеных на 1 снежня 1941 г. гарадская ўправа складалася з 12 аддзелаў: агульнага кіраўніцтва, школьнага, культуры і навукі, сацыяльнага забеспячэння, аховы здароўя, гарадскога будаўніцтва (тэхнічны аддзел), гарадскіх прадпрыемстваў, гарадскіх прамысловых прадпрыемствах, фінансаў і падаткаў, гарадскога гаспадарчага гандлю і прамысловасці, маёмасці, а ў дакуменце № 47, датаваным не раней за 1 ліпеня 1943 г., названыя ўжо секцыі і падсекцыі. Асаблівую каштоўнасць уяўляюць дакументы № 50 і № 53, якія характарызуюць полаўзроставы і нацыянальны склад насельніцтва горада на восень 1943 г. З паведамлення начальніка аддзела рэгістрацыі Брэсцкай гарадской управы для біржы працы вынікае, што ў Брэсце было зарэгістравана 33 694 чалавекі (14 667 мужчын і 19037 жанчын), з якіх ва ўзросце 1—12 гадоў — 3521 мужчынскага і 4023 жаночага полу, 13—50 — 8037 і 10 953, 51—100 — 3009 і 4051 адпаведна. Нацыянальны склад быў наступным: фольксдойчэ — 46, украінцы — 2135, беларусы — 5422, палякі — 16 806, чэхі — 19, рускія — 2547, савецкія грамадзяне 6418, іншыя — 320 (с. 56). Як вынікае з дакумента, большасць насельніцтва горада складалі палякі, яўрэі ж, якія мелі значную долю ў насельніцтве Брэста да вайны, наогул не згадваюцца. Пададзеныя лічбы сведчаць аб скарачэнні насельніцтва горада за час акупацыі, што пацвярджае справаздача харчовага аддзела ад 10 лістапада 1943 г., у якой адзначана: *"У жніўні 1941 г.... горад Брэст-Літоўск налічваў... 51 000 жыхароў (33 000 арыйцаў і 18 000 яўрэяў)"* (с. 132). Заўважым, што прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў, акрамя яўрэйскай, аднесеныя да арыйцаў. Са справаздачы вынікае, што ў 1943 г. колькасць жыхароў Брэста скарацілася ў выніку знішчэння яўрэйскага насельніцтва. З іншых дакументаў мы ведаем, што ліквідацыя Брэсцкага гета адбылася з 15 па 18 кастрычніка 1942 г. Яўрэйскае насельніцтва горада было вывезена на станцыю Бронная Гара і расстраляна.

На жаль, складальнікі зборніка не растлумачылі тэрмін "савецкія грамадзяне", што сустракаецца ў дакуменце № 50.

Прадстаўленыя ў раздзеле дакументы даюць уяўленне пра палітыку германскіх уладаў у дачыненні да прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў, што пражывалі тады ў горадзе. У адрозненне ад Генеральнай акругі Беларусь, на тэрыторыі якой В.Кубэ з восені 1941 г. рабіў стаўку на падтрымку беларускіх калабарацыяніцкіх арганізацый, што найбольш яскрава знайшло адлюстраванне ў яго лозунгу "Беларусь для беларусаў", у Брэсце, які ўвайшоў у склад рэйхскамісарыята Украіна, праводзілася палітыка ўкраінізацыі. Дзяржаўнымі мовамі былі аб'яўлены нямецкая і ўкраінская. Аднак украінскай мовай большасць жыхароў Брэста не валодала, таму ўжо 6 лістапада 1941 г. Брэсцкі гарадскі камісар у сваім распараджэнні адзначаў: *"прымаючы да ўвагі асаблівую структуру горада Брэст-Літоўск, дапускаецца выкарыстанне польскай мовы да таго моманту, калі я ўстанаўлю той факт, што ўсе жыхары разумеюць украінскую мову"* (с. 24). З-за недахопу кадраў украінскай нацыянальнасці да 1943 г. аснову супрацоўнікаў гарадской управы складалі палякі на чале з М.Бранікоўскім, і толькі з 1943 г. — украінцы на чале з Ф.Малютай. Украінізацыі павінны былі садзейнічаць і мерапрыемствы ў галіне адукацыі, і асабліва выданне газеты "Наше слова" на ўкраінскай мове — друкаванага органа Брэсцкага акруговага камісарыята. Зразумела, што такія адносіны да ўкраінскай нацыі дыктаваліся не клопатам аб яе прадстаўніках, а адпавядалі нацыянальнай палітыцы акупантаў, якая, як падкрэсліваў А.Гітлер, *"павінна заключацца ў тым, каб заахвочваць любую форму рознагалоссяў і расколу"*[2]. Пададзеныя ў раздзеле матэрыялы служаць яшчэ адным доказам таго, што ў мэты нацысцкага кіраўніцтва Германіі не ўваходзіла стварэнне незалежнай Беларусі.

*Раздзел 2 "Экономика и городское хозяйство"* налічвае 76 дакументаў і падзелены на тры падраздзелы "Городское хозяйство", "Налогообложение, ценообразование", "Торговля и работа предприятий". У першым з іх прадстаўленыя дакументы аб дзейнасці фінансавых органаў (дак. 56, 57), аб выяўленні, уліку і захаванасці маёмасці (дак. 58—64, 66-67, 69—71, 82-83), аб рэгістрацыі і ўтрыманні хатняй жывёлы і птушак (дак. 68, 73, 74, 80) і інш.

Цікавасць выклікае другі падраздзел, што ўключае дакументы, якія характарызуюць акупацыйную палітыку падаткаабкладання і цэнаўтварэння. Яны даюць уяўленне аб цэнах на розныя прадукты (дак. 84, 85, 87, 93, 97, 101), падатках, якія плацілі жыхары горада (дак. 86, 88, 90—92, 94, 95, 100). З прадстаўленых дакументаў можна даведацца і аб грашовай сістэме (дак. 96, 99). Так, з аб'явы № 1 Брэсцкай гарадской управы ад 3 ліпеня 1941 г. вынікае, што *"згодна пастановы нямецкіх уладаў, у грашовым звароце*

*абавязковай манетай з'яўляецца выключна савецкі рубель і нямецкая марка"* (с. 75). Дадзенае рашэнне пацвярджаецца распараджэннем бургамістра ад 14 красавіка 1942 г. (с. 88). Аднак 14 ліпеня 1942 г. усім аддзелам, установам і прадпрыемствам Брэсцкай гарадской управы паступіла ўказанне бургамістра наступнага зместу : "...*2) усю наяўнасць, што маецца ў рублях ад 5 рублёў і вышэй ад прынятых аплат, а таксама авансаў унесці сёння не пазней 12 гадзін у галоўную гарадскую касу. У далейшым плацяжы неабходна прымаць толькі ў карбованцах...*' " (с. 89).

У трэцім падраздзеле ўтрымліваюцца звесткі аб дзейнасці гарадскіх рынкаў, прамысловых прадпрыемстваў, пунктаў грамадскага харчавання. Паводле дадзеных, на 25 верасня 1941 г. у Брэсце налічвалася 11 рэстаранаў, 5 кафэ-бараў, 5 сталовых, закусачная (с. 95). У чэрвені 1944 г. дзейнічала 344 прыватных і 15 дзяржаўных прадпрыемстваў (с. 108).

*У раздзеле 3 "Продовольственное обеспечение города"* змешчаны дакументальныя матэрыялы, якія раскрываюць праблему харчовага забеспячэння горада. Дакументы сведчаць, што з 1 верасня 1941 г. у Брэсце была ўведзена картачная сістэма на хлеб і іншыя харчовыя тавары, уведзены нормы харчовага забеспячэння жыхароў (дак. 138, 139, 146, 149, 151, 152, 155, 156, 160). Карткі мелі персанальны характар і выдаваліся ва ўсіх пунктах продажу на падставе агульных спісаў, складзеных аддзелам прапіскі гарадской управы па месцы жыхарства з прадстаўленнем асабістых дакументаў. Увядзенне картачнай сістэмы ў першую чаргу было накіраванае на выяўленне асоб, якія ўхіляліся ад працоўнай павіннасці. Згодна з дадзенымі, прадстаўленымі выконваючым абавязкі начальніка харчовага аддзела гарадской управы, на 1 ліпеня 1942 г. устаноўленыя нормы харчовага забеспячэння распаўсюджваліся на 28 028 чалавек, падзеленых на 4 групы (па якім прынцыпе адбываўся падзел, тут не расшыфроўваецца). Такая расшыфроўка ўтрымліваецца ў справаздачы харчовага аддзела ад 10 лістапада 1943 г.: *"дзеці да 14 гадоў (К. 1/2), звычайны непрацуючы спажывец (Гр. 1), сем'і людзей, якія працуюць у інтарэсах Германіі (Гр. 2), працуючыя ў інтарэсах Германіі (Гр. 3), рабочыя, занятыя на асабліва цяжкіх работах (Гр. 4)"* (с. 133). У лепшым становішчы знаходзіліся прадстаўнікі 3-й і 4-й груп. Да катэгорыі працуючых у інтарэсах Германіі адносіліся супрацоўнікі германскіх і мясцовых лясных, харчовых, прамысловых і іншых прадпрыемстваў. У склад 4-й групы былі ўключаны спецыялісты ваенных прадпрыемстваў і чыгункі, работнікі шахт і каменаломняў. Спіс уключаў 17 724 яўрэяў. А гэта значыць, што знішчэнне жыхароў горада яўрэйскай нацыянальнасці яшчэ не набыло масавага характару. У дадзеным спісе можна ўбачыць і такую катэгорыю насельніцтва, як ваеннапалонныя. Аднак іх колькасць не ўказаная (с. 129). Дакумент № 155 сведчыць, што ў ліпені 1942 г. у горадзе існавала турма, у якой знаходзілася 400 чалавек (с. 129).

*Раздзел 4 "Социальная сфера и здравоохранение"* падзелены на два падраздзелы. У падраздзеле 4.1. "Социальное обеспечение" паказана дзейнасць акупацыйных структур у сацыяльнай сферы. Да 1 сакавіка 1943 г. пытанні сацыяльнай сферы знаходзіліся ў кампетэнцыі спецыяльнага аддзела гарадской управы. Аб асноўных накірунках яго дзейнасці сведчаць наступныя радкі справаздачы аддзела за перыяд з 1 па 15 жніўня 1941 г.: *"З моманту арганізацыі аддзела сацыяльнага забеспячэння пасля пачатку* **нямецка-савецкай вайны** (выдзелена намі. — **У.З.**) *дзейнасць аддзела сацыяльнага забеспячэння, акрамя закрытых устаноў па прычыне недастатковых матэрыяльных рэсурсаў горада абмяжоўвалася выключна* **падкормліваннем беднага насельніцтва** *у трох гарадскіх сталовых, пераважна* **палітычных зняволеных** (так у дакуменце. — **У.З.**), *пагарэльцаў, выселеных асоб, а таксама саветак з дзецьмі, якія не маюць ні мужоў, ні хатняга ачагу... Па меры паляпшэння матэрыяльных рэсурсаў горада аддзел сацыяльнага забеспячэння пачаў прадстаўляць дапамогу ў большай ступені беднаму насельніцтву ў выглядзе грашовай дапамогі на пакупку хлеба, дапамогі ў пахаванні, выдачы адзення і абутку"* (с. 137).

У сакавіку 1943 г. функцыі сацыяльнага забеспячэння з кампетэнцыі гарадской управы перайшлі да створанага Мясцовага камітэта самадапамогі. Існавалі беларускія, рускія, украінскія камітэты. Іх фонды фарміраваліся з ахвяраванняў жыхароў акругі, датацый акупацыйных улад, членскіх узносаў, даходаў ад дзейнасці падведамасных устаноў. Мэтай камітэта было *"павышэнне і захаванне на магчыма высокім узроўні здароўя насельніцтва і павелічэнне яго творчых сіл"* (с. 171). Такі клопат аб жыхарах горада тлумачыўся тым, што мясцовыя працоўныя рэсурсы з'яўляліся ключавым аб'ектам германскай эканамічнай палітыкі на акупаванай тэрыторыі. Справаздачы аб дзейнасці камітэта друкаваліся ў газеце "Наше слово" (дак. № 179, 185, 187).

Не менш цікавымі ў навуковым плане з'яўляюцца 24 (№ 191—214) дакументы раздзела 4.2 "Медико-санитарная ситуация в городе", якія ўтрымліваюць звесткі аб палітыцы акупацыйных улад у галіне аховы здароўя. Паводле іх інфармацыі, ужо 8 ліпеня 1941 г. палявой камендатурай 184 бургамістру горада было дадзена ўказанне аб прадстаўленні спісаў урачоў і медыцынскага персаналу, аб інфекцыйных захворваннях і хваляваннях сярод хворых (с. 155). Як сведчыць дак. № 207, у ліпені 1943 г. у падпарадкаванні аддзела аховы здароўя гарадской управы знаходзіліся наступныя лячэбныя і прафілактычныя ўстановы: гарадская бальніца, скурна-венералагічная бальніца і амбулаторыя, агульная амбулаторыя з рэнтгеналагічным і светалячэбным кабінетам, хуткая дапамога, дэзінфекцыйны пункт, зубная клініка, лабараторыя па даследаванні якасці прадуктаў харчавання, гарадская пральня, чатыры гарадскія аптэкі, гарадская лазня (с. 164). Матэрыялы органаў кіравання і медыцынскіх устаноў паказваюць, што мерапрыем-

ствы акупацыйных улад па ахове здароўя насельніцтва праводзіліся ў межах неабходнага для падтрымкі ў горадзе стабільнай медыка-эпідэміялагічнай сітуацыі і абароны ад наступстваў, звязанных з развіццём масавых захворванняў. Праграма, распрацаваная акупантамі, была накіраваная на аказанне лячэбнай дапамогі жыхарам горада, арганізацыю санітарна-засцерагальных мерапрыемстваў па папярэджанні распаўсюджання інфекцый. Асаблівая ўвага надавалася хворым на сухоты. Па інфармацыі начальніка секцыі аховы здароўя бургамістру гарадской управы ад 12 студзеня 1944 г. *"у горадзе Брэст-Літоўску значны працэнт насельніцтва заражаны туберкулёзам... Секцыя 3 просіць Вас выдаць распараджэнне, каб у смету на 1944 г. былі ўнесены сродкі на адкрыццё пры гарадской амбулаторыі туберкулёзнага дыспансэра"* (с. 169). Галоўнай задачай праводзімай палітыкі з'яўлялася падтрымка працаздольнасці насельніцтва.

Зварот да дакументаў *раздзела 5 "Образование, культура. Деятельность общественных и религиозных организаций, пропаганда"* дазваляе ўбачыць асноўныя накірункі школьнай, культурнай, канфесійнай палітыкі акупантаў, дзейнаць грамадскіх арганізацый і прапагандысцкага апарату. Асаблівасці адукацыйнай сітуацыі ў горадзе на працягу 1941—1944 гг. раскрываюцца ў падраздзеле 5.1 "Состояние образования". З яго дакументаў вынікае, што адметнай рысай школьнай палітыкі акупацыйных улад стала ўкраінізацыя школы. Першым крокам у гэтым кірунку было ўвядзенне ўкраінскай мовы ў якасці прадмета ў школьныя праграмы, скарачэнне і нават забарона выкладання на рускай мове. Аднак дадзеная забарона мела больш фармальны, чым фактычны характар. Так, згодна з тыднёвым планам урокаў на 1942/1943 навучальны год школы № 10 Брэста, на выкладанне ў 1—4 класах украінскай мовы адводзілася 16 гадзін, а рускай — 24 (с. 175). Такая сітуацыя тлумачылася недахопам кваліфікаваных настаўніцкіх кадраў.

Таму сярод галоўных накірункаў школьнай палітыкі было забеспячэнне прафесійнай падрыхтоўкі настаўнікаў, а таксама і спецыялістаў-рамеснікаў, што было выклікана вострым недахопам кваліфікаванай рабочай сілы. Нягледзячы на ўсе намаганні ўладаў, задача ўкраінізацыі брэсцкіх школ не была вырашана. На кастрычнік 1942 г. у Брэсце было 13 пачатковых школ: украінскіх 3 (налічвалася 394 вучня), рускіх 3 (681 вучань), польскіх 6 (1716 вучняў) і беларуская 1 (57 вучняў). У горадзе таксама існавалі сярэдняя школа з украінскай мовай навучання (300 вучняў), украінская 3-гадовая тэхнічная дзяржаўная школа (290 вучняў), украінская рамесная школа для хлопчыкаў (60 вучняў), украінская жаночая рамесная школа (60 вучаніц), польская прыватная 3-гадовая гандлёвая школа (303 вучні, прыватныя польскія механічныя курсы (120 вучняў) і польская прыватная музычна-драматычная школа (95 вучняў). Усяго ў брэсцкіх школах налічвалася 107 класаў, 4076 вучняў, 171 настаўнік (с. 175). Да таго ж назіралася агульнае змяншэнне колькасці школ, выкліканае ў першую чаргу, змяненнямі ваенна-палітычнай сітуацыі, пашырэннем партызанскіх зон. Характарызуючы адукацыйную палітыку, неабходна памятаць, што навучальна-выхаваўчы працэс, арганізаваны грамадзянскімі акупацыйнымі ўладамі, меў адметную нацыянальна-прапагандысцкую афарбоўку, нацысцкую сутнасць і быў накіраваны галоўным чынам на падрыхтоўку неабходных акупантам кадраў.

Аб культурным жыцці ў горадзе можна даведацца з дакументаў, змешчаных у падраздзеле 5.2 "Культурная жизнь". Большасць з іх прысвечана дзейнасці тэатра (дак. № 238—240, 243, 247, 248, 251, 254, 259—263) і кінатэатраў (дак. № 237, 241, 246). У справаздачы аб дзейнасці тэатра за перыяд з 26 чэрвеня 1941 г. па 31 мая 1942 г. яго дырэктар і мастацкі кіраўнік Гарнась адзначаў, што яго акцёрамі было дадзена 232 прадстаўленні, пераважна для нямецкіх салдат (для вермахта былі вызначаны 6 ігравых дзён і 2 прадстаўленні для грамадзянскага насельніцтва) (с. 192, 197).

Акрамя прафесійнага тэатра ў Брэсце існаваў украінскі народны сцэнічны калектыў. Але на пасяджэнні ў ландрата доктара Швайгера 13 красавіка 1942 г. было адзначана, што дадзены калектыў не з'яўляецца прафесійным і не можа выкарыстоўваць тэрмін "тэатр". Калектыву было дадзена права выступаць у раёнах, і адзін раз у месяц яму прадстаўлялася гарадская сцэна, пры ўмове, што яна не выкарыстоўвалася па прызначэнні (с. 191). Такое рашэнне дыктавалася нежаданнем мясцовай адміністрацыі ствараць канкурэнцыю гарадскому тэатру. Не было дазволена адкрыць украінскі тэатр мініяцюр. З дазволу акупацыйнай адміністрацыі ў горадзе працавалі два кінатэатры — "Андрыя" і "Міраж". Трэці — кінатэатр Сарвера не абслугоўваў гледачоў з-за аварыйнага стану памяшкання.

Важнае месца ў правядзенні ідэалагічнай работы сярод насельніцтва нямецкімі ўладамі надавалася друку. Як пісаў 21 студзеня 1942 г. генеральны камісар Валыні і Падолля акруговым камісарам: *"украінскія газеты ўяўляюць сабой важны інструмент прапаганды для правядзення агітацыі сярод насельніцтва і для кіравання імі"* (с. 5). 5 красавіка 1942 г. выйшаў першы нумар украінскамоўнай газеты "Наше слово". На старонках гэтага выдання асвятляліся дзейнасць грамадскіх і культурных аб'яднанняў у галіне палітыкі, культуры, спорта (дак. 249, 252, 253, 255—259, 264, 265). У сваім звароце да ўкраінскага насельніцтва горада ў сувязі з пачаткам выпуска газеты брэсцкі акруговы камісар Роле, у прыватнасці, адзначыў наступнае: *"УКРАІНЦЫ. Правадыр Адольф Гітлер вызваліў вас ад страшэннага бальшавіцкага панавання... Вашай падзякай Правадыру павінна быць супрацоўніцтва з намі, якое дапаможа вызваліць Еўропу ад бальшавізму"* (с. 191).

Дзейнасць грамадскіх і рэлігійных арганізацый, у тым ліку і па прапагандысцкім забеспячэнні іс-

нуючага парадку, асвятляецца ў падраздзеле 5.3. "Деятельность общественных и религиозных организаций, пропаганда". З 18 дакументаў раздзела 10 прадстаўляюць матэрыялы з газеты "Наше слово" (дак. № 271, 272, 275—279, 281—283). З іншых адзначым пратакол пасяджэння праўлення Рускага камітэта ўзаемадапамогі 16 жніўня 1943 г. аб адносінах камітэта да вярбоўкі добраахвотнікаў у Рускую вызваленчую армію. Праўленне адзінагалосна прыняло наступную прапанову: *"у рамках сваіх магчымасцяў і пры ўмове атрымання ад нямецкіх улад адпаведнага дазволу камітэт можа прыняць дзейсны ўдзел пры арганізацыі вярбоўкі добраахвотнікаў у РВА — у гор. Брэсце і Брэсцкай акрузе"* (с. 211). Дадзены дакумент (№ 280) яшчэ раз сведчыць, што калабарацыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны набыла разнастайныя ваенныя, палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя формы і ўзмацняла структуры акупацыйнага рэжыму ў Беларусі.

Самым значным па аб'ёме і змесце з'яўляецца *раздзел 6 "Положение населения города в период оккупации"*, у 4 падраздзелах якога раскрываюцца разнастайныя аспекты жыцця акупаванага горада. З самага пачатку акупацыі эканоміка горада і яго людскія рэсурсы былі пастаўлены на службу інтарэсам захопнікаў. Дэфіцыт рабочай сілы ў Германіі вымусіў А.Гітлера пайсці на шырокае выкарыстанне прымусовай працы грамадзянскага насельніцтва і ваеннапалонных з захопленых нацыстамі краін. Прымусовы, эксплуатацыйны і нават рабскі характар мела эканамічная палітыка Германіі і ў Брэсце. Аб гэтым сведчаць факты, пададзеныя аўтарамі ў раздзеле 6.1 "Принудительный труд, угон населения в Германию". Так, 24 лістапада 1941 г. гарадскі камісар выдаў распараджэнне, якім забаранялася самавольна пакідаць працоўнае месца. Невыкананне яго разглядалася як сабатаж, а *"тыя, хто не будзе выконваць дадзенае распараджэнне, могуць быць па прадстаўленні аддзела працы пакараны камісарам горада — штрафам у неабмежаваным памеры; накіраваннем у лагер прымусовых работ; у больш цяжкіх выпадках нават турмой ці катаржнай турмой"* (с. 214). 13 снежня 1941 г. быў выдадзены загад Брэсцкага акруговага камісара, пацверджаны 28 чэрвеня 1942 г. аб працоўнай павіннасці, паводле якога праводзілася агульная рэгістрацыя асоб мужчынскага і жаночага полу ва ўзросце ад 14 да 65 гадоў. За ухіл ад рэгістрацыі прадугледжваліся грашовыя штрафы ці турэмнае зняволенне ў залежнасці ад прычыны нез'яўлення на рэгістрацыю (с. 217, 218). Акупацыйныя ўлады выкарыстоўвалі і больш жорсткія меры пакарання. Так, згодна з загадам каменданта крэпасці генерал-лейтэнанта Шэллера ад 6 красавіка 1944 г. *"... Асобы, якія ўхіляюцца ад рэгістрацыі і не з'яўляюцца своечасова на указанае месца працы, па сваёй ахвоце адлучаюцца з працы ці сабатуюць працу, будуць накіраваны ў лагер прымусовых прац, а пры цяжкіх парушэннях будзе прымяняцца* ***СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ*** (выдзелена ў дакуменце. — **У.З.**). *Сем'і тых, хто ўхіляецца ад працы будуць эвакуіраваны з Брэста, калі яны сваім удзелам у сабатажы не заслужылі больш цяжкую кару"* (с. 221). Як вынікае, караліся не толькі парушальнікі загаду, але і члены іх сямей.

Важнай задачай эканамічнай палітыкі нацыстаў быў вываз рабочай сілы на працу ў Германію. У пачатку 1942 г. пачалася шырокая агітацыйна-прапагандысцкая кампанія па дабраахвотным выездзе насельніцтва на працу ў Германію. Разам з вярбоўкай на добраахвотнай аснове шырока прымянялася і прымусовая мабілізацыя. У прапагандысцкіх мерапрыемствах актыўны ўдзел прымаў калабарацыйны друк. Так, у газеце "Наше слово" 3 мая 1942 г. была змешчана "Кіраўніцтва па адборы работнікаў для выезду ў Германію", у якім адзначалася: *"прымаюцца да ўвагі : 1) мужчыны ва ўзросце ад 14 да 45 гадоў. 2) жанчыны ва ўзросце ад 14 да 35 гадоў. 3) Асобы, якія старэй вышэй адзначанага ўзроставага цэнзу, але яшчэ не хворыя і маюць жаданне працаваць у Германіі"* (с. 215). Паводле паведамлення "Рэгістрацыя моладзі", змешчанага ў газеце 6 снежня 1942 г., *"уся мужчынская і жаночая моладзь ад 15 да 18 гадоў (а менавіта: народжаныя ў 1924, 1925, 1926 і 1927 гадах) 2-га, 3-га і 4-га снежня павінна зарэгістравацца і прайсці медыцынскі агляд для выкарыстання яе на земляробчых работах у Германіі. Адначасова падлягаюць рэгістрацыі* ***УСЕ*** (так у дакуменце. — **У.З.**) *настаўніцы і настаўнікі"* (с. 219).

Асобны падраздзел 6.2 "Положение еврейского населения города" зборніка прысвечаны жыццю яўрэяў у акупаваным нацыстамі горадзе. Палітыка акупацыйных уладаў у дачыненні да яўрэйскага насельніцтва спалучала рэпрэсіі і атрыманне выгады ад яго працы. Нягледзячы на каштоўнасць яўрэйскіх спецыялістаў, у іх працы і яе аплаце існавалі сур'ёзныя абмежаванні. Так, ужо 18 ліпеня 1941 г. бургамістр Брэста выдае распараджэнне аб звальненні *"усіх асоб яўрэйскай нацыянальнасці, а таксама яўрэйскага паходжання, якія працуюць у якасці канторскіх работнікаў, памочнікаў пры вярбоўцы насельніцтва на работы па навядзенню парадку на тэрыторыі горада Брэста, а таксама <u>служачых нізавога звяна</u>* (выдзелена ў дакуменце. — **У.З.**)*"* (с. 222). А распараджэннем ад 17 верасня 1941 г. *"усе яўрэі, якія працуюць на камунальных і дзяржаўных работах, павінны адзін дзень у тыдзень працаваць бясплатна... дырэктары прадпрыемстваў... пры складанні плацёжных ведамасцей павінны памятаць аб тым, што яўрэі атрымліваюць толькі 80% ставак, якія ўстаноўлены для арыйскіх работнікаў"* (с. 226).

У падраздзеле 6.3 змешчаны ўсяго адзін дакумент "Из отчета Брестского городского подпольного горкома КП(б)Б за период с июня 1941 г. по февраль 1944 г.", складзены ў кастрычніку 1944 г., ужо пасля вызвалення горада ад акупантаў.

Важнай крыніцай па гісторыі акупацыйнага рэжыму ў Беларусі сталі матэрыялы Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі (НДК) па выяўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх

саўдзельнікаў і нанесеных імі страт грамадзянам, калгасам, грамадскім арганізацыям, дзяржаўным прадпрыемствам і ўстановам СССР. Камісія была створана паводле Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 2 лістапада 1942 г. з ліку дзяржаўных, грамадскіх дзеячаў, прадстаўнікоў навукі і культуры пад старшынёўствам М.М.Шверніка. Пастановай СНК СССР ад 16 сакавіка 1943 г. прадугледжвалася стварэнне рэспубліканскіх, краявых і абласных камісій садзеяння НДК, а таксама раённых, сельскіх камісій пры саюзных і рэспубліканскіх наркаматах[3]. Са жніўня 1944 г. па красавік 1945 г. працавала Брэсцкая абласная камісія садзеяння. Змешчаныя ў падраздзеле 6.4 матэрыялы дадзенай камісіі (акты, заявы грамадзян, пратаколы апытанняў сведкаў) пацвярджаюць факты масавых забойстваў, рабунку і разбурэнняў у Брэсце (дак. 329—344).

Істотным дапаўненнем дакументальнай часткі зборніка з'яўляюцца дадаткі ў двух частках. У першай сабраныя 11 запісаў успамінаў удзельнікаў Брэсцкага гарадскога падполля. У другой утрымліваюцца копіі разнастайных дакументаў акупацыйных уладаў на рускай, украінскай і нямецкай мовах, грашовых знакаў, якія мелі хаджэнне ў горадзе, а таксама фотаздымкі, якія ілюструюць жыццё акупаванага Брэста.

Важнай складовай часткай зборніка з'яўляецца і падрыхтаваны аўтарамі навукова-даведачны апарат, які ўключае заўвагі па тэксце і змесце дакументаў, імянны паказальнік, спіс скарачэнняў, пералік выкарыстаных фондаў і публікуемых крыніц. Высокай ацэнкі заслугоўваюць навуковыя каментары.

Большая частка дакументаў зборніка публікуецца ў поўным аб'ёме. Размешчаныя ў храналагічным парадку дакументы ўтрымліваюць рэдакцыйны загаловак, у якім указваецца разнавіднасць дакументаў, аўтар, адрасат, кароткі змест і дата напісання. Кожны дакумент мае легенду, што змешчана пад тэкстам і ўключае яго пошукавыя дадзеныя (назву архіва, нумары фонда, справы, аркушы). У форме канцавых спасылак даюцца тэкставыя заўвагі і каментары.

Дакументы, уключаныя ў зборнік, былі напісаныя на чатырох мовах: нямецкай, польскай, украінскай і рускай, што ў значнай ступені выклікана нацыянальнай палітыкай акупантаў. Тэкставыя крыніцы на рускай мове друкуюцца на мове арыгіналу, на нямецкай, украінскай, польскай — у перакладзе на рускую мову. Зборнік адпавядае неабходным патрабаванням, якія прад'яўляюцца да дакументальных выданняў. У цэлым яго складальнікам удалося справіцца з пастаўленай задачай і паказаць *"штодзённае жыццё акупаванага горада, мала асвятляемае айчыннымі гісторыкамі"* (с. 8). Разам з тым па-за іх увагай з-за адсутнасці ў Дзяржаўным архіве Брэсцкай вобласці дакументаў паліцэйскіх, карных органаў, засталася рэпрэсіўная палітыка акупантаў у адносінах да мірнага насельніцтва. На наш погляд, мэтазгодна было ўключыць у рэцэнзуемы зборнік дакументы з іншых архіваў, у першую чаргу Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, што дазволіла б больш усебакова паказаць сутнасць акупацыйнай палітыкі германскіх уладаў.

Аднак выказаныя заўвагі не зніжаюць высокай навуковай вартасці дакументальнага выдання "Брест в 1941—1944 гг. Оккупация. Документы и материалы". Уведзеныя ў навуковы зварот новыя дакументальныя факты і архіўныя крыніцы дазваляюць па-новаму разгледзець праблему штодзённага жыцця ў гады нацысцкай акупацыі, больш глыбока раскрыць розныя аспекты жыццядзейнасці горада і акупацыйных уладаў, асвятліць працэс стварэння мясцовых органаў улады і іх структуру. Значны факталагічны матэрыял дазволіў аўтарам паказаць асноўныя накірункі нямецкай акупацыйнай палітыкі ў Брэсце, які спачатку знаходзіўся ў падпарадкаванні ваеннай адміністрацыі (з 22 чэрвеня па 1 верасня 1941 г.), а затым — у складзе рэйхскамісарыята Украіна, акругі Валынь — Падолле (да лютага 1944 г.), рэйхскамісарыята Остланд, састаўной часткай якога была Генеральная акруга Беларусь. Неабходна заўважыць, што характэрнай рысай савецкай і постсавецкай беларускай гістарыяграфіі з'яўляліся даследаванні пераважна працэсаў, якія адбываліся на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь. Як сведчаць дакументы, аснову акупацыйнай стратэгіі складала палітыка генацыду, накіраваная на фізічнае знішчэнне савецкіх людзей, эксплуатацыю прамысловасці і сельскай гаспадаркі, працоўных рэсурсаў Беларусі, а таксама вываз беларускага насельніцтва ў Германію. Дадзенае выданне з'яўляецца значным укладам у вывучэнне маладаследаванага аспекту гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — гісторыі паўсядзённасці жыхароў беларускіх гарадоў, рабочых прамысловых прадпрыемстваў, служачых, а таксама жанчын, ваеннапалонных, вязняў гета, дзяцей на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг. Матэрыялы зборніка ствараюць новыя магчымасці для далейшага вывучэння штодзённага жыцця розных катэгорый насельніцтва Беларусі ў жорсткіх і складаных умовах акупацыі, іх узаемаадносінаў з германскімі адміністрацыйнымі органамі і ўстановамі, дазваляюць больш глыбока ацаніць глабальныя працэсы і іх трансфармацыю на лакальным узроўні.

[1] Брест в 1919—1939 гг. Документы и материалы; сост. А.Г.Карапузова [и др.]. Брест, 2009; Брест в 1939—1941 гг. Документы и материалы; сост. А.Г.Карапузова [и др.]. Брест, 2012.

[2] Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы на Беларусі: Зборнік навуковых артыкулаў. Мінск, 1998. С. 42.

[3] Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 5. Мінск, 1999. С. 296.

***Уладзімір Здановіч,*** *доктар гістарычных навук, загадчык кафедры гісторыі Беларусі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта.*